# § 6. Правядзенне індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў БССР

***Успомніце.*** **1.** У чым заключалася аграрнае пытанне і як яно было вырашана згодна з Дэкрэтам аб зямлі?
**2.** Што азначаюць паняцці *індустрыялізацыя* і *кааперацыя*?

***Вучэбная задача.*** Вызначыць узаемасувязь паміж індустрыялізацыяй і калектывізацыяй сельскай гаспадаркі як сродкамі пабудовы новага грамадства і вынікі іх правядзення ў БССР.

**Прычыны, асаблівасці і метады правядзення індустрыялізацыі ў БССР.** У другой палове 1920-х гг. новая эканамічная палітыка была паступова згорнута. Рашэнне аб правядзенні ў БССР **індустрыялізацыі** было прынята ў **1925 г.** Яна ўяўляла сабой працэс стварэння буйной машыннай вытворчасці ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, і перш за ўсё ў прамысловасці. Індустрыялізацыя павінна была забяспечыць пераадоленне эканамічнага адставання ад еўрапейскіх дзяржаў, рост колькасці рабочага класа і замацаванне савецкай улады.

Асаблівасцю правядзення індустрыялізацыі ў Савецкай Беларусі стала шырокае выкарыстанне значных прыродных запасаў лесу і торфу, а таксама рэзерваў рабочай сілы ў сельскай мясцовасці. У першыя гады індустрыялізацыі ў рэспубліцы развівалася лёгкая прамысловасць, якая мела перапрацоўчы характар і арыентавалася на выраб тавараў народнага спажывання. Атрымалі пашырэнне такія галіны прамысловасці, як харчовая, гарбарная, тэкстыльная, швейная, лясная, дрэваапрацоўчая, папяровая, па́ліўная.

У 1928—1929 гг. быў распрацаваны першы пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі — **пяцігодка**. Яе асноўнай мэтай стала ператварэнне СССР з аграрнай краіны ў індустрыяльную. Індустрыялізацыя ў БССР праходзіла фарсіраванымі (паскоранымі) тэмпамі пад лозунгам «Пяцігодку — у чатыры гады».

Адным з метадаў прыцягнення рабочых да ўдзелу ў правядзенні індустрыялізацыі было сацыялістычнае спаборніцтва за дасягненне лепшых эканамічных вынікаў. Яно развівалася ў такіх формах, як стаханаўскі рух (ад імя яго пачынальніка А. Стаханава), ударныя брыгады, а ў канцы 1930-х гг. — шматстаночнае абслугоўванне, сумяшчэнне прафесій і інш. Адным з ініцыятараў стаханаўскага руху ў БССР стаў майстар мінскай абутковай фабрыкі Рыгор Скобля. За адну рабочую змену ён абцягнуў 1500 пар абутку, што склала больш за 310 % ад нормы. Сацыялістычнае спаборніцтва было прынята працоўнымі з энтузіязмам, хоць яно і суправаджалася, як правіла, пераглядам нормаў выпрацоўкі ў бок іх павелічэння і зніжэннем платы за атрыманую прадукцыю. Людзі разумелі неабходнасць гэтага, жылі і працавалі з верай у светлую будучыню, якую самі стваралі. З радасцю ўспрымаліся весткі пра пабудаваныя прадпрыемствы, якія мацавалі індустрыяльную магутнасць Савецкай краіны.



Правообладатель Издательский центр БГУ




Індустрыялізацыя ў БССР у гады першых пяцігодак

*Карыстаючыся картасхемай, пацвердзіце выказванне старшыні Савета Народных Камісараў БССР Я. А. Адамовіча ў 1926 г.: «Беларускую прамысловасць мы ў асноўным павінны і можам развіваць галоўным чынам як прамысловасць па перапрацоўцы мясцовай сыравіны. У нас у бліжэйшы перыяд будзе развівацца прамысловасць лёгкага тыпу».*

Правообладатель Издательский центр БГУ



Завод сельскагаспадарчых машын у Гомелі. Фотаздымак 1930-х гг.

**Вынікі прамысловага развіцця БССР у перыяд першых пяцігодак.** У гады першай пяцігодкі (1928—1932) былі пабудаваны і пачалі працаваць швейная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі» і панчошна-трыкатажная фабрыка імя КІМ (скарочаная назва Камуністычнага інтэрнацыянала моладзі — міжнароднай арганізацыі ў 1919—1943 гг.) у Віцебску, Магілёўская фабрыка штучнага валакна, Бабруйскі і Гомельскі дрэваапрацоўчыя камбінаты, завод сельскагаспадарчых машын у Гомелі і інш.

У выніку другой і трэцяй пяцігодак (1933—1937; 1938—1941) прамысловасць рэспублікі папоўнілася Крычаўскім цэментавым, Магілёўскім аўтарамонтным заводамі, Мінскім радыёзаводам, на якім выпускаліся прыёмнікі «Піянер» і «КІМ», Рагачоўскім кансервавым заводам, Барысаўскай макароннай і Мінскай каўбаснай фабрыкамі.

У 1935 г. за поспехі ў эканамічным развіцці БССР была ўзнагароджана ордэнам Леніна (**). У выніку правядзення фарсіраванай індустрыялізацыі БССР да канца 1930-х гг.ператварылася ў індустрыяльна-аграрную краіну.

**Прычыны, метады і асаблівасці правядзення калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў БССР.** У гады нэпа ў беларускай вёсцы праходзіла кааперацыя сялянскіх гаспадарак. Яна мела такія формы, як гандлёвыя кааператывы, таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі, што адпавядала распрацаванаму У. І. Леніным кааператыўнаму плану. Асноўнымі яго прынцыпамі былі добраахвотнасць пры стварэнні сялянамі кааператываў і паступовы пераход ад простых формаў кааперацыі да больш складаных. Усімі формамі сельскагаспадарчай кааперацыі ў рэспубліцы ў 1928 г. было ахоплена звыш 50 % сялянскіх гаспадарак.

У 1927 г. было прынята рашэнне аб правядзенні палітыкі **калектывізацыі** сельскай гаспадаркі — аб'яднання індывідуальных гаспадарак сялян у калектыўныя гаспадаркі (калгасы). Яны з'яўляліся вышэйшай формай вытворчай кааперацыі, і імі ў 1928 г.



Правообладатель Издательский центр БГУ

было ахоплена каля 1 % сялянскіх гаспадарак. Правядзенне калектывізацыі тлумачылася неабходнасцю забеспячэння горада сельскагаспадарчай сыравінай і прадуктамі ва ўмовах індустрыялізацыі. Гэтую задачу не маглі выканаць дробныя аднаасобныя сялянскія гаспадаркі. Патрабавалася стварэнне буйны́х сялянскіх гаспадарак з выкарыстаннем машыннай тэхнікі.

Ажыццяўленне фарсіраванай індустрыялізацыі патрабавала значных сродкаў, якія вырашана было атрымаць за кошт вёскі. Дзяржава знізіла закупачныя цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю, што выклікала нежаданне сялян прадаваць збожжа па нізкіх коштах. У выніку ўзнік так званы «хлебны крызіс» 1928—1929 гг. У ім абвінавацілі заможных сялян, якіх называлі кулакамі. У савецкую гісторыю **1929 г.** увайшоў пад назвай «Год вялікага пералому». Так называўся артыкул І. В. Сталіна, надрукаваны ў газеце «Праўда», які стаў тэарэтычным абгрунтаваннем пераходу да палітыкі суцэльнай калектывізацыі. Запісванне сялянства ў калгасы з 1929 г. не заўсёды адбывалася добраахвотна. У лютым 1930 г. было прынята рашэнне калектывізаваць да сакавіка 75—80 % сялянскіх гаспадарак. У БССР асаблівасцю калектывізацыі стала тое, што яна суправаджалася масавым і паскораным ссяленнем хутарскіх гаспадарак у калгасныя цэнтры. Пры ўступленні сялян у калгас нярэдка абагульваліся не толькі іх сельскагаспадарчая тэхніка, прылады працы, коні, пабудовы, але і індывідуальная маёмасць. Здаралася, што ў калгас прымушалі аддаваць нават свойскую жывёлу (кароў) і птушку (курэй).

№ 6

Тых, хто не жадаў запісвацца ў калгасы, маглі прылічыць да кулакоў. У дачыненні да іх праводзілася **раскулачванне**, у ходзе якога гвалтоўна адымалася іх маёмасць. Раскулачаных высялялі ў Сібір і ў паўночныя раёны СССР. Пасля раскулачвання пэўная частка маёмасці заможных сялян даставалася беднякам. З пачаткам суцэльнай калектывізацыі раскулачванне ператварылася ў палітыку ліквідацыі кулацтва як класа, якая праводзілася ў жорсткай форме. У грамадстве ствараўся вобраз кулака як ворага народа.

**З успамінаў сведкі раскулачвання Антона Семяновіча**

Селянін ніяк не мог зразумець, чаму гэта ён павінен набытую сваім мазалём гаспадарку аддаць у калгас, працаваць на кагосьці і чакаць, пакуль нехта злітуецца і дасць кавалак хлеба. Але партыйныя камісары… агітуюць людзей за калгас… імкнуцца даказаць перавагу калектыўнай працы над індывідуальнай… стараюцца знайсці прычыну… нежадання ўступаць у калгас. І такую прычыну яны вельмі хутка знаходзяць: вінаватыя, маўляў, кулакі, гэтыя заклятыя ворагі савецкай улады, якіх трэба знішчыць як клас. Калі ж хто будзе патураць кулакам, на таго таксама знойдзецца ўправа…

*Чаму, на вашу думку, сяляне не маглі зразумець неабходнасць уступлення ў калгас?*

Правообладатель Издательский центр БГУ



Ворыва ў калгасе



Сяўба ў калгасе

*Вызначце з апорай на фотаздымкі эфектыўнасць калектыўнай і механізаванай працы ў сельскай гаспадарцы.*

**Вынікі калгаснага будаўніцтва ў БССР у перыяд першых пяцігодак.** У выніку правядзення суцэльнай калектывізацыі ў БССР была створана матэрыяльна-тэхнічная база, неабходная для далейшага індустрыяльнага развіцця рэспублікі. З мэтай забеспячэння калгасаў тэхнікай утвараліся машынна-трактарныя станцыі (МТС). Першая МТС у БССР была створана ў 1930 г. у мястэчку Койданава (цяперашні Дзяржынск).

Калектывізацыя прывяла да змянення сацыяльнай структуры насельніцтва, бо адбыўся рост калгаснага сялянства. У 1939 г. калгасы аб'ядноўвалі больш за 90 % сялянскіх гаспадарак. Праца ў калгасах аплачвалася не грашыма, а прадуктамі ў канцы года па колькасці адпрацаваных дзён — так званых працадзён. З сярэдзіны 1930-х гг. у калгасах рэспублікі быў вызначаны мінімум выпрацоўкі працадзён — 80. Калгаснікаў, якія не выконвалі гэтага мінімуму, прыцягвалі да адміністрацыйнай адказнасці.

У 1932 г., калі ў СССР была ўведзена пашпартная сістэма, калгаснікам пашпартоў не выдалі. Атрымаць іх яны маглі з дазволу праўлення калгаса. Правы калгаснікаў на перамяшчэнне і свабодны выбар працы фактычна было абмежавана.

Сучасныя гісторыкі лічаць, што калектывізацыя адпавядала задачам пабудовы індустрыяльнага грамадства. Аднак яна праводзілася шляхам «рэвалюцыйнага націску». Гэта прывяло да перагібаў пры стварэнні калгасаў і негатыўнага эфекту ад праведзеных мерапрыемстваў. Аказаліся знявечанымі лёсы многіх тысяч людзей. Матэрыяльнае становішча насельніцтва заставалася цяжкім, хаця людзей не пакідала вера ў лепшую будучыню.

***Новыя паняцці і тэрміны***: *індустрыялізацыя, пяцігодка, калектывізацыя, раскулачванне.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

**** Першая дзяржаўная ўзнагарода БССР**

Найвышэйшай дзяржаўнай узнагародай БССР у 1924—1933 гг. з'яўляўся ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР. На ордэне адлюстраваны зорка, сякера, серп, каласы, зубчастае кола. Ордэн № 1 быў уручаны таварыству «Васількі». Яго ўдзельнікі — жыхары вёскі Васількі Бялыніцкага раёна Магілёўскай акругі — вылучыліся ў асушэнні мясцовага балота. Ордэнамі таксама былі ўзнагароджаны чыгуначныя палкі, што будавалі дарогу Орша — Лепель, пагранічныя войскі БССР.

*Выкажыце меркаванне, чаму ўзнікла ідэя ўвесці ўзнагароду за працу ў выглядзе ордэна.*




Ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР

1. Ахарактарызуйце палітыку індустрыялізацыі і калектывізацыі ў БССР паводле наступнага плана: а) прычыны правядзення; б) метады; в) асаблівасці правядзення; г) вынікі.
2. Дакажыце, што БССР у гады першых пяцігодак ператварылася ў індустрыяльна-аграрную рэспубліку.
3. Параўнайце ленінскі кааператыўны план і сталінскі план суцэльнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Вызначце, які з гэтых планаў дазваляў ажыццявіць ідэю паступовага добраахвотнага пераводу сельскай гаспадаркі з індывідуальнага на калектыўны характар вытворчасці.
4. Вызначце, у чым заключаўся «вялікі пералом» у вёсцы.
5. Выкажыце меркаванне, чаму калгаснікі не атрымалі пашпартоў, уведзеных у 1932 г. для грамадзян БССР.
6. Уявіце сябе ў ролі рабочага завода ці фабрыкі, пабудаваных у гады першых пяцігодак, або селяніна, які працаваў у калгасе. Якім было б ваша стаўленне да працы? Свой адказ растлумачце. Звярніцеся да метадычнай парады «Як мадэляваць свае паводзіны ва ўмоўнай гістарычнай сітуацыі» на с. 179.

## § 7. Грамадска-палітычнае жыццё БССР у 1920—1930-я гг.

***Успомніце.*** Як змянілася тэрытарыяльнае становішча Беларусі пасля Рыжскага міру?

***Вучэбная задача.*** Ахарактарызаваць працэс фарміравання беларускай савецкай дзяржавы і яе грамадска-палітычную сістэму.

**Удзел БССР ва ўтварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.** У працэсе пошуку і выпрацоўкі канкрэтных формаў аб'яднання савецкіх рэспублік

Правообладатель Издательский центр БГУ